А ў канюшні стаяла адзінаццаць коней і некалькі жарабятак. Пакуль збегліся на пажар людзі, агонь ужо гуляў ва ўсю. Буданіна ж драўляная, дрэва сухое, час летні, гарачы вецер так і падпільноўвае, каб дзе з агнём пасваволіць. І дачакаўся свайго часу. У момант чырвоныя языкі полымя пралізалі саламяны дах, віхорам на ім закруціліся, нібы чэрці пусціліся польку кружыць. Неўзабаве блакітныя пісягі агню пацяклі па драўляных сценах.

У стайні страшны перапалох: моцны тупат капыт, храп, дзікае ржанне, тоненькае павіскванне жарабятак. Адны коні ад страху і болю шалеюць, а другія выбілі пысамі шыбы ў маленькіх прадаўгаватых акенцах, усунулі ў іх, як у хамуты, галовы і стаяць, развітваючыся з жыццём, — з пыс, парэзаных аб шкло, цячэ кроў, з вачэй — слёзы.

Ускочыць бы ў стайню, адкінуць запоры, выпусціць кожнага каня са стойла, але ўжо позна; шырокія вароты ў канюшню зацягнула полымем. Агонь кіпіць, гудзе — паспрабуй сунься туды.

У гэты момант з варот, скрозь вірлівае полымя, выскачыла кабыла: усё ж, відаць, змагла выбіць капытамі ў стойле запоры-завалы. Вырвалася з вогненнага пекла на двор, з разгону не ўтрымалася на нагах, упала на калені. І тут жа ўсхапілася, узнеслася на дыбы, каб далей адбегчы ад жаху. Але ў гэты момант з агню, па той бок варот, пачуўся пранізлівы крык жарабяці. З глухога тупату, іржання, храпу адрозніла яна: гэта галосіць яе дзіцятка, кліча на дапамогу яе, мамку.

Яна аслупянела ад крыку жарабяці! Як паднялася на дыбы, так і замерла, пераступаючы заднімі нагамі, уздрыгваючы целам. І раптам павярнулася галавою да варот — людзі толькі жахнуліся — і нырнула назад у агонь, да свайго дзіцяці.

Тут і злілося полымя ў варотах, скруцілася ў адзін вялізны вогненны жмут; тут з грукатам, пырскаючы іскрамі і асеў, асунуўся дах...

Плот

Муж Зоі Алесь давёў да ладу ўдавіцы Марылі паламаны плот. І тая, па вясковай завядзёнцы, запрасіла яго на абед. У гэты час і Зоя забегла ў хату — папрасіць пасуседску запалак. Пераступіла парог і бачыць: сядзіць яе Алесь за сталом перад бутэлькай, а Марыля насупраць: вараныя яйкі лупіць ды падкладвае ў талерку работніку. На закусь.

— Ой, Марылька, разбэсціш ты майго мужа, — смяецца на ўсе застаўкі Зоя, — лупленымі яйкамі корміш... Хіба ж ён без рук? Хіба сам яйка не ацярэбіць?

Весела, раскаціста смяялася, а прыйшла дамоў збянтэжаная, змрочная. Падалося жанчыне, што вельмі ж Марыля дагаджала яе Алесю. І надта ж ласкава на яго пазірквала, ахвотна падкладваючы яму ў талерку лупленыя яйкі.

Вярнуўся Алесь дамоў.

— Што ж гэта яна цябе лупленымі яйкамі корміць, га?! — спытала дрыжлівым голасам.

— А я за чужым сталом не гаспадар. Што даюць, тое і ем, — суха адказаў муж.

На другі дзень Зоя сама з сябе здзівілася. Чаму гэта з яе галавы не выходзяць гэтыя лупленыя яйкі? Нават смешна стала. "Выкінь іх з галавы!" — загадала сабе.

І не змагла выкінуць. Засела, застрамілася ў душы... На месяцы, нават на гады. То быццам бы прападзе ўспамін пра яйкі, то зноў падступіць да сэрца, кальне. І ў такія хвіліны Зоя, нібы рэчка ў паводку, выходзіла з берагоў, ускаламучвалася:

— Як яна табе дагаджала! Падумаць толькі — лупленымі яйкамі з далоняў карміла: на, галубок, клюй, клюй, шызы... А ты размяк, асалавеў. Мабыць, накляваўся... У-у-у, нячыстая душа! У-у, гад падкалодны.

Крывавыя далоні

Аднойчы ў вёсцы давялося мне весці гутарку з Людмілай Іванаўнай Корзун, загадчыцай аддзела культуры райвыканкама. І расказала яна мне вось такое:

— Прыехалі мы, самадзейныя артысты, неяк у поле. Там калгасніцы церабілі лён. Знарок прыкацілі ў абедзенны перапынак. А жанкі ўжо сабраліся на мяжы. У нас — новая праграма. Пачалі весці канцэрт... Бачу, ідзе ён з настроем, з натхненнем. Па тварах калгасніц гэтае ж самае заўважаю: уважлівыя вочы, добрыя ўсмешкі. Але што такое — няма апладысментаў. Ніхто не пляскае ў ладкі. Мае артысты пачалі нервавацца...

І толькі калі канцэрт закончыўся, усё стала зразумелым. Падыходзіць да нашых артыстаў пажылая льнаводка і кажа: "Дзякуй, мілыя людцы, за канцэрт! За тое, што парадавалі! Адразу мякчэе на душы, калі нашыя песні пачуеш... Толькі не майце на нас крыўды, што далонямі мы не можам вам пляскаць... Яны ў нас усе льном да крыві парэзаныя... Надта ж баляць... Хоць гвалтам крычы... Хіба ж імі запляскаеш у ладкі...

І працягнула артыстам свае далоні: парэпаныя, зморшчаныя, да крыві парэзаныя льном.

У лекара

— Дзе ў вас, бабуля, баліць?

— Упала я.

— Дзе ж вы ўпалі?..

— Так вось і ўпала. Ішла з унукам. Нясу яго на бярэмку. Цяжкі, як камень... Цяльпух гэты. Рукі адцягвае да самай зямлі... А на вуліцы, бачыш, які галалёд! Я і паслізнулася... Але неяк крутанулася, калі падала, на бок, каб унучка з рук не выпусціць. І не выпусціла, на яго не звалілася... Неяк вывернулася, кажу. А сама бокам аб мёрзлую зямлю грымнулася... Цяпер усё цела баліць... Ты ўжо, доктарка, само тое месца знайдзі, дзе больш баліць. Па сваёй навуцы. Я сама, бачыш, цяпер не магу паказаць. І рукі, і спіна, і бок — усё баліць... Але так і быць: добра, што ўнук не ўдарыўся аб мёрзлую зямлю...

Сум

Нечакана сустрэў аднагодка, з якім у дзяцінстве бегаў босы і разам пасвіў свіней. Мо гадоў трыццаць не бачыліся.

Я закідаў яго пытаннямі: дзе жыве, якая работа, хто жонка, колькі дзяцей і ўнукаў? Ды ці мала пра што спытаеш у чалавека, якога не бачыў больш за чвэрць века!

Распытваю і адчуваю, што адказваць яму цікава. І прыемна. Як жа! Усё ладна і складна ў яго жыцці... І добрую кватэру мае ў горадзе, і машыну, і дачу... І дзеці вывучыліся, на свой хлеб пайшлі. За мяжу часта ездзяць... Смачна расказвае, адным словам. Нібы глушэц вясною на такавішчы такуе... Нават пачырванеў ад асалоды, ад пахвальбы сабе і сваім дзецям.

Мне — цікава. Слухаю. Столькі ж гадоў не бачыліся!

А калі развіталіся і калі я зноў у думках пачаў пракручваць нашую доўгую размову, дык раптам са здзіўленнем адзначыў, што за ўвесь гэты час (пяць гадзін прагаманілі) ён мне не задаў ні аднаго пытання. Ні аднаго-адзінага. Ну хоць пра нешта дробязнае, нязначнае незнарок — спытаў!

Сумна мне стала.

Навіны спорту

Вядомы ўсе ўдзельнікі чэмпіянату свету-98

Адборачны хакейны турнір, які праходзіў у аўстрыйскім Клагенфурце, унёс канчатковую яснасць у размеркаванне пуцёвак на маючым адбыцца чэмпіянаце свету па хакею з шайбай. У Швейцарыю, дзе ў наступным годзе пройдзе сусветнае першынства сярод каманд групы "А", адправяцца зборныя Казахстана і Аўстрыі.

Гэта стала вядома па выніках дадатковых спаборніцтваў чатырох прэтэндэнтаў, сярод якіх таксама былі каманды Нарвегіі і Польшчы. Дарэчы, трое з іх — хакеісты Казахстана, Аўстрыі і Нарвегіі набралі па чатыры ачкі, аднак у апошніх акаваліся горшыя паказчыкі.

Чэмпіянат свету-98 пройдзе ў двух гарадах — Базэлі і Цюрыху. Папярэдне ўсе 16 каманд разбіты на чатыры падгрупы. Разам з беларусамі будуць гуляць чэхі, немцы і японцы.

Галоўны прыз у беларускага гімнаста

У Швейцарыі, дзе закончыўся прэстыжны міжнародны турнір па спартыўнай гімнастыцы, вызначыўся наш Віталь Рудніцкі. Чэмпіён Еўропы-94, сярэбраны прызёр сусветнага чэмпіянату-97 у камандным заліку на гэты раз стаў уладальнікам Кубка Артура Гандэра, які разыгрываецца штогод.

Асаблівасцю гэтага турніру з'яўляецца тое, што на спаборніцтвах спартсмены выступаюць толькі ў мнагабор'і. На гонар магілёўскага гімнаста, ён на ўсіх снарадах не дапусціў ні адной памылкі.

Вячаслаў ДУТАЎ, БелТА.

Твой лёс, Беларусь!

Знаёмцеся: Івонка Сурвіла — старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі

Як беларускае замежжа з пакалення ў пакаленне перадае нацыянальную дэмакратычную спадчыну

Беларусь — адзіная краіна Усходняй Еўропы, якая да гэтага часу мае ўрад у эміграцыі. Ён апынуўся там у 1920 годзе пасля ўсталявання ў Мінску расійска-бальшавіцкай дыктатуры. Рада БНР выехала на Захад, каб змагацца за вызваленне Беларусі.

На пачатку 90-х гадоў, пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі, кебічаўскі ўрад дамагаўся ад кіраўніцтва БНР прызнаць у сваёй асобе адзіную законную ўладу Рэспублікі Беларусь. Але Рада БНР, усведамляючы вышыню свайго маральна-палітычнага становішча, прызнання ў свеце і, ведаючы прарасійскія настроі мінскай улады, праігнаравала маскоўскія і мінскія захады і пацвердзіла сваю вернасць у абароне ідэалаў 25 сакавіка.

Першы пасол ЗША ў Беларусі Дэвід Суорц з гэтай нагоды, выступаючы ў Нью-Йрку, адзначыў, што такое рашэнне Рады выглядае абачлівым і рацыянальным. Захад адзіны ў сваім поглядзе на сённяшняе кіраўніцтва ў Беларусі як на недэмакратычнае. Таму беларуская дэмакратычная і нацыянальная спадчына і законнасць захоўваюцца сёння беларускай дыяспарай.

30—31 жніўня ў Нью-Йрку прайшла 22-я сесія Рады Беларускай Народнай Рэспублікі. Яна абрала старшынёй Рады БНР мастачку і грамадскую дзяячку з Канады Івонку Сурвіла.

Хто яна такая? Якія яе погляды на жыццё? Вось што расказвае пра яе вядомая дзяячка і журналістка Валянціна Трыгубовіч, якая мела сустрэчы ў Канадзе з Івонкай.

Івонка Сурвіла, расказвае яна, абаяльная і мілая жанчына, таленавітая мастачка і актыўны грамадскі дзеяч. Жыве яна ў Канадзе, працуе ў адным з дэпартаментаў у Атаве, сталіцы Канады.

Мая гутарка адбылася з ёю ў яе гасцінным доме ў Квебеку, адкуль рукой падаць да Атавы. Ва ўсіх пакоях вісяць партрэты, пейзажы. Іх аўтары — Івонка і яе муж Янка Сурвілы.

Як яны трапілі ў замежжа? Бацька скончыў школу ў Вільні. Калі прыйшлі саветы, ён быў тэхнічным дырэктарам электрастанцыі ў Баранавічах. Яму загадалі даносіць на людзей. Ён адразу адказаў: "Гэта не мая справа. Я інжынер". Праз час прыйшлі ў дом, усё ператрэслі і бацьку арыштавалі, асудзілі. Маці хадзіла па судах, усюды пісала пісьмы. Нават да Сталіна. Мабыць, таму затрымалася адпраўка яго ў Сібір. Перад самым прыходам немцаў арыштаваныя збеглі з турмы. Падчас нямецкай акупацыі бацька працаваў у тэхнічнай школе, а затым выехалі ў Данію, затым у Францыю...

Цяпер невялікі фрагмент з той гутаркі.

— А ў якім узросце ты пачала маляваць?

— Першая рэч, якую я памятаю, — ілюстрацыя да казкі пра рэпку. Гэта было ў Баранавічах, мой першы дзень у школе. Я тады мела 6 гадоў. Ад таго часу я малявала заўсёды. (Апрача апошніх гадоў.) Сама сябе... З татам разам... Калі мы жылі ў Даніі, тата вучыў нас беларускай гісторыі. Ён дыктаваў, а мы мусілі пісаць. Так адначасна вучыліся і мове, і гісторыі. А тады малявалі Рагнеду, яе сына... У 16 гадоў я атрымала бронзавы медаль на выстаўцы школьных работ.

— Тваім першым настаўнікам малявання быў тата?

— Спецыяльна, быццам, і не вучыў. Я прасіла: "Тата, намалюй гэта"... і была побач.

— Чаму ж не ўдалося вучыцца?

— А я вучылася.

— Як доўга і дзе?

— У Вышэйшай школе мастацтваў у Парыжы. 16 месяцаў інтэнсіўных заняткаў. Толькі маляванне — чатыры гадзіны штодзень. Прафесары, усё знакамітасці, прыходзілі раз на тыдзень крытыкаваць нашы творы. Мы шмат малявалі аголеную натуру. Тэарэтычныя курсы я таксама ўсе прайшла.

Прафесар мой прадказваў, што праз сем гадоў я стану вялікім мастаком. Мне было тады дваццаць. Ён пазнаваў мае рэчы без подпісу, колькі б ні было выстаўлена побач іншых студэнцкіх работ. Казаў: "А, гэта тая маленькая Івонка..." Але я скончыла Сарбону, філалагічны факультэт — ангельская і скандынаўскія мовы. І адразу выйшла замуж за Янку. Гэта была ўмова маіх бацькоў — шлюб толькі пасля дыплома. А мы ж лічылі дні, пісалі лісты... Я паехала да Янкі ў Іспанію, мы працавалі там на радыё. Вялі беларускія перадачы. Матэрыяльна жылося вельмі цяжка. Часу на маляванне амаль не было. Зрабіла некалькі заказных партрэтаў. Дагэтуль люблю маляваць людзей. Пейзажам зацікавілася толькі ў час паездкі ў Беларусь (Красавік 1992 г. — **В.Т.**). Хацелася як бы затрымаць краявіды, узяць іх з сабою. Вядома, іспанскія музеі і галерэі мы не міналі з Янкам.

— Пра беларускае радыё ў Мадрыдзе мы з Янкам гаварылі... Для мяне гэта было адкрыццё. І пра гэта я яшчэ буду пісаць. Радыё ж закрылі, каб дагадзіць Маскве...

— Калі пераехалі ў Канаду, я неяк даволі хутка ўключылася ў мастацкае жыццё. У 1972 годзе ўжо мела выставу. Памятаю, намалявала адзін абразок, які ўсім чамусьці адразу спадабаўся. І ўсе выказвалі жаданне купіць яго. Тады я аддала гэты твор газеце "Беларус". Яны правялі аўкцыён і займелі сабе больш за 400 долараў. Па тым часе гэта былі прыстойныя грошы. І артыкул невялікі надрукавалі. Потым доктар Тумаш арганізаваў некалькі выстаў у Беларускім інстытуце навукі і мастацтва (ЗША — **В.Т.**). Там былі аўтары з усяго свету. Доктару Тумашу вельмі падабаліся мае працы, і ён уключаў іх у экспазіцыю, нават калі сама я адсутнічала. Вядома, я паказвала свае творы ў Беларусім цэнтры ў Таронце. Потым увайшла ў адну канадскую арганізацыю. Тут вельмі шануецца друкаваная графіка — афорт, літаграфія. І я з 1979 да 1986 год штотыдзень тры гадзіны займалася друкаваннем, вывучэннем розных тэхнік і тэхналогій. А ў 1983 годзе ўрад Квебека, дакладней — Міністэрства культуры, рабіў выстаўку мастакоў чужаземнага паходжання. Было запрошана шмат аўтараў, і ў кожнага выбралі што-небудзь. (Мой абразок потым купілі, і ён вісіць у нейкай урадавай установе ў Квебеку.) Выбралі твор для выстаўкі, а мяне як бы штосьці падштурхвае: "Цікава, ці падпісалі яго як належыць?" Пытаюся, ці пазначана, што мая радзіма — Беларусь. "Не, мы напісалі, што Расея, падумалі, так будзе больш зразумела". Кажу: "Вяртайце мой абраз. Я не хачу ўдзельнічаць у гэтай выставе". Арганізатары спалохаліся, усё ж вельмі афіцыйна рабілася. Міністры розныя былі на вернісажы, здымкі, інтэрв'ю ў газетах. Мусілі лічыцца з маім меркаваннем.

У 1985 годзе з гэтых мастакоў някевбекага паходжання выбралі жанчын і зрабілі цудоўную экспазіцыю з іх твораў. Былі надрукаваныя для кожнага аўтара такія інфармацыйныя лісткі-каталогі. у маім паведамлялася, што "народжаная ў Беларусі Івонка Сурвіла здабыла мастацкую адукацыю ў Вышэйшай школе мастацтваў у Парыжы перад тым, як прыехаць у Канаду. Яе гравюры сведчаць пра багатую культурную спадчыну..." Згадваліся галерэі, дзе выстаўляліся мае работы. Мяне найбольш цешыла тое, што з тэкстаў выразна паўставала думка пра высокую і даўнюю культуру Беларусі. І газеты гэта не абмінулі. Атрымалася якраз так, як мне хацелася. Вельмі прыемныя ўражанні пакінулі ў мяне таксама кантакты з Саюзам французскіх школ правінцыі Антарыо. Яны маюць свае галерэі, запрашаюць мастака па ўласным выбары і ладзяць яго выстаўку. Такім чынам я і мае творы трапілі ва Уэланд на поўдні Антарыо. Сустрэчы са школьнікамі былі вельмі цікавымі. Амаль кожную гадзіну — новая група. Я давала каментарыі, тлумачыла, адказвала на пытанні, расказвала дзецям пра Беларусь. Гэта была мая апошняя, так бы мовіць, бясхмарная імпрэза. Потым — Чарнобыль.

— Ты кінула творчасць і занялася грамадскай працай, камітэтам дапамогі дзецям — ахвярам Чарнобыля?

— Я была проста ў роспачы ад той трагедыі, якая звалілася на зямлю Беларусі і яе народ. Потым хадзіла па рэдакцыях газет, каб прыцягнуць увагу канадскага грамадства да праблем маёй Бацькаўшчыны. Паступова стварыўся Камітэт дапамогі. І мы збіраем ахвяраванні на лекі, на адпачынак дзяцей, такім чынам пашыраем веды пра Беларусь, яе клопаты і праблемы.

— Як сябра гэтага камітэта ты і была ў Мінску на канферэнцыі?

— Так. Гэта была мая першая сустрэча з Бацькаўшчынай пасля цэлага жыцця на чужыне. Я пазнала цудоўных людзей, наведала мясціны, дзе ў дзяцінстве і ў юнацтве жыў Янка, — ён іх заўсёды ўспамінае, пабачыла родзічаў... Надзвычай важнымі для мяне сталіся сустрэчы з мастакамі, знаёмства з іх творамі. Я была захоплена. Мае нататкі пра гэтую паездку друкавала газета "Беларус". Шкадую толькі, што мела няшмат часу на музеі і майстэрні.

— Івонка, а ці вашы дзяўчаткі — Ганя і Паўлінка — малююць? Дзе яны жывуць? Ці ўжо замужам?

— Паўлінка некаторы час вучылася маляванню. Але музыка перацягнула. Дарэчы, Паўлінка збіраецца прыехаць у Беларусь, каб правесці такое сацыялагічна-музычнае даследаванне. Фінансава яе падтрымае адна аўтарытэтная арганізацыя. Спадзяюся, калі ўсё вырашыцца як мае быць, сустрэнецеся з ёю. Ганя жыве ў Францыі, Паўлінка — у Злучаных Штатах. Абедзве замужам, маюць адукацыю, працуюць.

Алесь ДРАБЧУК.

Ваше здоровье

Вдыхая розы аромат...

Можно ли узнать о целебных свойствах ароматических масел. Слышала, что все масла лечебные, но что чем лечить, не знаю.

Галина Григорьевна,
г.Глубокое.

Специалисты по лечению запахов (их, кстати, называют аромотерапевтами) утверждают, что ароматические масла благотворно влияют не только на человеческое тело, но и на разум и эмоции. Используют масла разным образом: добавляют в ванну, втирают в кожу, делают компрессы, окуривают ими помещения.

В случае простуды, к примеру, рекомендуется принять ванну с 2 каплями эвкалиптового масла.

При раздражении кожи, покраснениях на лице можно использовать масло авокадо.

При головной боли натрите виски и лоб смесью из 20 капель розмаринового масла, 10 капель масла ромашки, 50 мл масла абрикосовых косточек. Можно принять и ванну с 2 каплями розмарина и 2 каплями розового масла.

Ароматические масла способны также поднять настроение, снять усталость и даже, говорят, улучшить характер. Ревнивым и упрямым нужно вдыхать ароматы розы и жасмина, слишком нерешительным или ко всему равнодушным — базилика, перечной мяты, кипариса, жасмина, застенчивым — красной гвоздики и мелиссы. Однако во всем надо знать меру. Эфирные масла — вещества крайне концентрированные, поэтому для пользы дела достаточно всего нескольких капелек. Сильный перебор (особенно если окуривать ароматическими веществами комнату) может привести к головной боли и другим побочным эффектам.

Старую косметику — в урну

Я никак не могу решиться выбросить старые помады и крема, которыми практически не пользуюсь. Подружка говорит, что если я пользуюсь старой косметикой, то наношу вред своей коже. Интересно, а как долго можно хранить косметику?

Лариса.

Конечно, права. Неправильное использование косметики может нанести вред вашему здоровью, и средствам макияжа тоже "нужен уход".

Избежать неприятностей вам поможет соблюдение нескольких несложных правил.

Не пользуйтесь пудрой и другими косметическими средствами в порошках, если они лежали открытыми год. А срок хранения косметики в тюбиках истекает уже через три месяца.

Как можно чаще мойте кисточки для макияжа шампунем и тщательно прополаскивайте водой. А губку для нанесения тонального крема используйте не более трех раз, потом выбрасывайте — иначе она превратится в рассадник микробов.

Если карандаш для подводки глаз или контурный для губ упали на пол, заточите их, чтобы удалить налипшие пыль и грязь. Точилка тоже требует ежедневного ухода.

Если вы носите контактные линзы, красьте ресницы специальной тушью. Обыкновенная тушь содержит микроскопические волокна, которые, попав под веко, вызывают раздражение слизистой оболочки глаза.

Никому не одалживайте свою косметику и маникюрные принадлежности — это негигиенично. К тому же можно подхватить конъюнктивит или заразиться грибком. Но если вы все-таки одолжили маникюрные ножнички, обязательно продезинфицируйте их.

Стрессы губят наш желудок

Вы часто перебиваетесь бутербродами? От стрессов предпочитаете рюмочку "для успокоения" и сигарету? Глотаете лекарства, не зная, как они действуют на желудок? Тогда не удивляйтесь, что этот самый желудок у вас болит.

От неприятных симптомов — изжоги, отрыжки, последствий злоупотребления спиртного, кофе, неприятных ощущений после диеты — можно принимать Маалокс.

Принимать его следует по 1 столовой ложке или же 1—2 таблетки через час после еды. Именно в это время в желудке начинает наиболее активно выделяться соляная кислота, которая раздражает его стенки. На ночь перед сном следует повторить прием. Если ритм вашей жизни такой, что между двумя приемами пищи проходит очень много времени, не вредно принять Маалокс еще раз — скажем, между обедом и ужином или при возникновении болей. В течение 30 минут после приема лекарства хорошо бы не пить никакой жидкости. И, конечно же, не следует забывать о здоровом питании.

Принимая препарат, необходимо помнить, что самостоятельно "прописать" его себе можно лишь при изжогах, неприятных ощущениях и умеренных болях в желудке. В случае язвенной болезни или запущенного гастрита необходимо проконсультироваться с врачом.

Чабрец и кашель побеждает

Не подскажете, как можно вылечить кашель народным способом?

А.Мартынович,
Минская обл.

В любой аптеке вы сможете купить набор трав, настои из которого рекомендуется пить от кашля.

Кроме того при фарингите, ларингите, трахеите, бронхите рекомендуют, к примеру, такой сбор: плоды фенхеля (1 часть), листья мяты перечной, цветки ромашки лекарственной, листья шалфея (по 3 части). Чайную ложку этой смеси нужно заварить стаканом кипятка, дать настояться в течение получаса. После чего полученный настой процедить и прополоскать им горло. И так в течение 6-8 дней.

Другой популярный вариант: трава чабреца (1 часть), трава душицы (2 части), листья мать-и-мачехи (2 части). Две столовые ложки смеси залить 500 мл кипящей воды, настаивать в течение 20 минут и процедить. Пить по одной четвертой стакана 2—3 раза в день и по полстакана перед сном.

При этом обязательно имейте в виду: если вы кашляете уже более двух недель и никакие травки не помогают, нужно срочно обратиться к врачу.

Держи спину

У вашего ребенка вдруг начали выпирать лопатки или неожиданно появилась сутулость. Не спешите все списывать на возраст и не считайте это безобидным для подрастающего организма "недостатком", который пройдет без следа. Не дай Бог, спустя год или два вы узнаете, что у ребенка сколиоз.

Сколиоз — деформация позвоночника, характеризуется его боковым дугообразным искривлением и скручиванием вокруг вертикальной оси.

Специалисты считают, что существуют, условно говоря, два вида сколиоза. Развитие первого могут спровоцировать такие заболевания, как полиомиелит, артрит, артроз, рахит, различные травмы. Вторым видом сколиоза мы часто "награждаем" себя сами, таская тяжелый портфель или криво сидя за столом.

Если у вас появилось подозрение, что со спиной творится что-то неладное, не тяните время и обязательно обратитесь к врачу. Если чувствуете себя нормально, все равно не забывайте, что позвоночник может легко превратиться в коромысло. Постарайтесь профилактики ради выполнять совсем несложные рекомендации:

— во сне: кровать должна быть функциональной, расслабляющей все мышцы — ровной, не очень мягкой и не очень жесткой;

— при подъеме тяжестей: ни в коем случае не нагибайтесь вперед. Если предмет стоит на земле, присядь и поднимай его, вставая;

— на работе: выбирай низкие стулья — угол между бедром и голенью должен быть прямым, спина касаться спинки стула, а экран компьютера находиться на уровне глаз;

— в спортзале: проводите там хотя бы полтора часа в неделю. Бегайте, разминайтесь — заставляйте мышцы работать! Но отказывайтесь от вертикальной силовой нагрузки и не забывайте о плавании — самом полезном для спины виде спорта. В свой гимнастический комплекс обязательно включите упражнения для мышц, поддерживающих позвоночник: лежа на спине, приподнимайте сначала торс, а потом закидывайте ноги за голову, стараясь носками достать до пола.

И напоследок. Запомните, отчего портится осанка:

— от сидячего образа жизни;

— от неправильного положения тела во время сна;

— от систематического перенапряжения отдельных групп мышц;

— от неправильного питания;

— от чрезмерных физических нагрузок.

Подготовила Мария ВИКТОРОВА.

ДАІ інфармуе

Узяўся за гуж — будзь у правілах дуж

У краіне павялічылася колькасць дарожна-транспартных здарэнняў, звязаных з гужавым транспартам. Напрыклад, за 9 месяцаў гэтага года іх стала больш на 2,3 працэнта ў параўнанні з такім жа перыядам мінулага года. Асабліва значны рост у Гомельскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях — адпаведна на 80, 60 і 20 працэнтаў.

Як сказаў у гутарцы з карэспандэнтам БелТА намеснік начальніка УДАІ рэспублікі палкоўнік міліцыі Аркадзь Цахавой, большасць з такіх здарэнняў — гэта наезды аўтатранспарту на павозкі. За гэты час іх зафіксавана 44. Часцей за ўсё яны здараліся ў цёмны час сутак. Асноўная ж іх прычына — парушэнні ў тэхнічным абсталяванні гужавога транспарту. Да...

цыяльныя аперацыі "Гужавая павозка", аднак колькасць такіх аварый усе роўна выклікае сур'езную занепакоенасць. Вось толькі два з нядаўніх трагічных здарэнняў.

9 лістапада ў тры гадзіны ночы ў Дубровенскім раёне пенсіянеры — муж і жонка, вяртаючыся дадому з гасцей, ехалі на калёсах з жанчынай са сваёй вёскі. Пераязджаючы мост цераз раку Мярэя каля вёскі Масліно, павозка перакулілася. Пад раніцу з вады ўдалося выцягнуць целы загінуўшых жанчын. Мужчыну, які таксама патануў, адразу не знайшлі.

10 лістапада вечарам на дарозе каля вёскі Любінічы Шклоўскага раёна вадзіцель аднаго з Брэсцкіх ТАА, кіруючы аўтобусам "Мерсэдэс", наехаў на павозку, якая пераязджала...

Віншуем!

Метрабудаўцы атрымалі ўзнагароды

За дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў пры будаўніцтве Мінскага метрапалітэна, укараненне перадавых форм і метадаў працы праходчык тунэльнага атрада № 1 дзяржаўнага будаўнічага прадпрыемства "Мінскметрабуд" Сяргей Уладзіміравіч Бахар узнагароджаны ордэнам Айчыны трэцяй ступені.

Указ аб гэтым прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка падпісаў на гэтым тыдні.

Таксама падпісаны ўказ...

Дзень у гісторыі

14 лістапада

У 1765 г. нарадзіўся **Роберт Фултан**, амерыканскі вынаходнік, стваральнік першага практычна прыгоднага парахода. А пачынаў ён як чаляднік ювеліра, пасля займаўся жывапісам і ў рэшце рэшт зацікавіўся інжынернай справай...

У 1860 г. быў падпісаны **Пекінскі трактат**, які вызначаў усходнія і заходнія межы паміж Кітаем і Расіяй. Дагавор падрабязна рэгламентаваў руска-кітайскія гандлёвыя зносіны.

У 1902 г. у Мінску выйшаў першы нумар грамадска-палітычнай і літаратурнай газеты **"Северо-Западный край"**, якая ўзнікла ў выніку пашырэння праграмы і дэмакратызацыі газеты "Минский листок". Выходзіла штодзённа, змагалася за дэмакратыю і нацыянальнае раўнапраўе. Надрукавала першы верш Янкі Купалы "Мужык". Потым гэтая газета стала трыбунай мясцовай арганізацыі РСДРП.

У 1920 г. адбылося антыбальшавіцкае **паўстанне на Случчыне**. Паўстанцы змагаліся да канца снежня 1920 г.

У 1926 г. у Мінску пачалася першая **Акадэмічная канферэнцыя па пытаннях рэформы беларускага правапісу і азбукі**. Сярод іншых да яе быў распрацаваны нават праект пераводу беларускай мовы на лацінскую графіку.

У 1939 г. III (нечарговая) сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла Закон **"Аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад БССР"**. У выніку насельніцтва БССР павялічылася да 11 млн. чалавек.

У 1990 г. у Парыжы ў будынку ЮНЕСКА адбылася святочная памятная цырымонія ў гонар 500-годдзя з дня нараджэння беларускага асветніка і першадрукара **Францыска Скарыны.**

Старонкі храналогіі гартаў Юльян ГРЫГАРОВІЧ.

Гастролі

Да нас прыехаў цырк "Сію". Кітайскі

Кітайскі цырк лічыцца самым традыцыйным у свеце. Такім ён быў і сто, і дзвесце, і тысячу гадоў назад. У ім развіваліся толькі эквілібрыстыка, гімнастыка і акрабатыка. Але, як сцвярджаюць аматары цыркавога мастацтва, кітайскі цырк з любога маленькага правінцыйнага гарадка — гэта заўсёды самы высокі прафесійны ўзровень. Але для еўрапейца любая кітайская праграма — фантастычная і падчас незразумелая з'ява. Мабыць, таму, вызначыць, добрая ці дрэнная праграма, могуць толькі самі кітайцы.

І яшчэ. Калі ў еўрапейскіх цырках галоўнае — атракцыёны з жывёламі, то аснову кітайскага цырка складае акрабатыка. Гледзячы на выступленні замежных артыстаў, у вас міжвольна можа скласціся ўражанне, што яны наогул не маюць скелета! Падобных цыркачоў у старажытным рускім цырку называлі "гуттаперчывымі мальчикамі". Аднак цыркавому рамяству артысты пачынаюць вучыцца з маленства. Верагодна, таму гавораць, што беларусы раніцай робяць зарадку, а кітайцы — выконваюць цыркавыя трукі...

Дарэчы, гастролі цырка "Сію" будуць працягвацца да 19 лістапада.

Марына ВІШНЕЎСКАЯ.

Спорт

■ *Гандбол*

Завершились первые матчи 1/8 финала гандбольных еврокубков и первого тура Лиги чемпионов

Единственная белорусская команда в еврокубках, вышедшая в 1/8 финала Кубка городов, — бельничская "Друть-Белпак", которая играла в Румынии с командой "Рулменцул" из Брашова.

Как бы ни хотелось нам признать, но румынский женский гандбол куда сильнее белорусского. Хоть и занимает "Рулменцул" 8-ю строчку в чемпионате Румынии, он все равно без проблем переиграл "Друть-Белпак" со счетом 38:19. И уже перед ответной игрой в Минске 16 ноября ясно, кто пройдет в 1/4 финала Кубка городов.

Ну а теперь перейдем к выступлению белорусских легионеров.

Клуб Александра Синяка — немецкий "Лемго" — в стартовом матче Лиги чемпионов в группе "D" уступил в гостях македонскому клубу "Яфа". Наш соотечественник забросил в этом матче 3 мяча.

Несомненно, благодаря Михаилу Яхимовичу, забросившему 8 мячей, испанская "Каха-Кантабрия" в Кубке кубков у себя дома переиграла чешский "Ковопетроль" со счетом 32:21.

А в женской Лиге чемпионов в группе "D" австрийский "Хипо" разгромил в Италии со счетом 35:23 клуб "Римини". К победе своего клуба приложила руку и Алла Васькова. Правда, забросила она только один мяч.

■ *Хоккей*

Первая шайба Руслана Салея в НХЛ

Стали известны все 16 сборных — участников чемпионата мира-98 в Швейцарии. Особенно приятно, что в их числе фигурирует и национальная сборная Беларуси. Команды разделены на 4 группы и проведут матчи в Цюрихе (группы "B" и "C") и Базеле (группы "A" и "D").

Группа "A" — Чехия, Германия, Беларусь, Япония.

Группа "B" — Канада, Италия, Словакия, Казахстан.

Группа "C" — США, Швеция, Швейцария, Франция.

Группа "D" — Россия, Финляндия, Латвия, Австрия.

Тем временем дебютировавший в этом сезоне в Национальной хоккейной лиге (НХЛ) за клуб "Анахайм" белорусский легионер Руслан Салей в игре против "Калгари" забросил свою первую шайбу. Воодушевленный таким успехом, Руслан забросил шайбу и в следующей игре с "Ванкувером". Лиха беда начало...

Алексей ЖУРАВЕЛЬ.

ТЕЛЕПРОГРАММА

Пятница, 14 ноября

Белорусское телевидение

07.30 Утренний коктейль.
07.45, 17.55 "Музыкальная обойма".
07.50 "Памятник". Док. фильм.
08.00, 13.00, 15.00, 18.00, 00.05 Новости.
08.10 Телебарометр. Прогноз погоды.
08.20 Бархатный сезон.
08.50 Мультфильм.
09.00 ТВ — школе. Белорусская литература. 8-й класс. "От имени народа". Франтишек Богушевич и его творчество.
09.30, 17.45 Экономикст.
09.40 Родное слово. Тележурнал.
10.10 "Мы — детям". Белорусский фонд социальной поддержки детей и подростков.
10.45 Мультфильм.
11.10 "Красное и черное". Худ. фильм. 5-я серия.
12.20 Зорная ростань.
15.15 Видеокурс немецкого языка. Передача 9-я.
15.35 Мультфильмы.
16.05 Переход. Программа для подростков.
16.30 Окружающий мир. Оздоровление белорусских детей в Дании.
17.00 Музыкальный антракт.
17.10 "Солдатки". Док. фильм Белорусского телевидения.
18.20 "Красное и черное". Худ. фильм. 5-я серия.
19.30 Тема дня.
19.45 "Спектр. Галереи XX века". Современное искусство в Гродно.
20.05 "В джазе только девушки". Развлекательная программа.
20.30 Осень — работ восемь.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.50 "Цептер" представляет: "Здравствуй и прощай". Худ. фильм.
23.25 Хоккей. Континентальный кубок. "Полимир" (Новополоцк) — "Юниерс" (Рига). 3-й период.
00.15 Акколада.

ОРТ

08.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.20 Новости.
08.15 "Девушка по имени Судьба". Сериал.
09.05 Клуб путешественников.
09.50 Домашняя библиотека.
10.20 Играй, гармонь любимая!
11.15 Программа "Вместе".
14.20 Фильм-сказка "Огонь, вода и... медные трубы".
15.55 "Улица Сезам".
16.25 Музыкальная программа "50 х 50".
17.20 "Девушка по имени Судьба". Сериал.
18.05 Погода.
18.15 Здоровье.
18.45 Поле чудес.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.35 Программа передач.
20.40 Великие сыщики: детектив "Упокойтесь с миром, миссис Коломбо".
22.35 Взгляд.
23.35 Ночной кинозал. Марина Зудина в детективе "Исповедь содержанки".
01.10 Программа передач.

Канал "Россия"

07.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести.
07.20, 23.15 Дежурная часть.
07.35 "Королева Марго". Сериал. 5-я серия.
08.30 Деньги.
08.50 Торговый дом.
08.55 Товары — почтой.
09.05 "Санта-Барбара". Сериал.
13.30 Н.Михалков и С.Крамаров в фильме "Приключения Кроша".
15.00 Мультфильм.
15.10 Графоман.
15.20 Лучше не бывает.
15.25 Экспо-вестник.
15.30 Парламентарий.
16.20 Православный календарь.
16.25 "Санта-Барбара". Сериал.
17.15, 23.30 Прогноз погоды.
17.20 Лукоморье.
17.40 "История одного события".
17.55 "Королева Марго". Сериал. 5-я серия.
19.25 Подробности.
19.45 L-клуб.
20.20 Совершенно секретно.
21.15 Слабо?
21.50 Мой Пушкин.
22.20 Вовремя.
22.25 Добрый вечер.
23.35 Русский вальс. Песни А.Пахмутовой поет Юлиан.
00.15 Эх, дороги!

Канал "Культура"

07.00 Музыкальный экспромт.
07.15, 13.00, 20.00, 23.00 Новости культуры.
07.30 Сериал "Берлин. Александрплатц".
09.00, 11.00, 15.00, 17.00 Новости.
09.05 "Под сенью дружных муз". К.Батюшков.
09.25 "Утешение оперой". В.А.Моцарт. "Дон Жуан".
10.35 "Культура и история". "Золото Рябушинских". Часть 2-я.
11.15 "Весна". Худ. фильм.
13.15 "2003 год". К 300-летию Санкт-Петербурга.
13.20 "Бал в Царском Селе". Майя Плисецкая.
14.10 "Легенды Большого..." Передача 8-я.
15.05 Полчаса на чудеса.
15.35 "Челленджерс". Сериал.
16.00 "Путешествие во времени". Программа Ю.М.Лотмана из цикла "Беседы о русской культуре". Передача 10-я.
16.45 "Культура городов мира". Садовая архитектура Великобритании.
17.05 "2003 год". К 300-летию Санкт-Петербурга.
17.50 "Демо". Передача об искусстве авангарда.
18.00 Лукоморье.
18.40 "Вечер с..." Андрей Вознесенский.
20.20 Сериал "Берлин. Александрплатц".
21.20 "Кумиры". В.Меркурьев.
22.00 "Идея власти... власть идеи". Док. сериал. 5-я серия.
23.20 Музыкальный экспромт.

НТВ

05.00, 09.00 Сегодня утром.
08.05 Сериал "Крутой Уокер: правосудие по-техасски".
09.15 Своя игра.
09.45 Криминал. "Чистосердечное признание".
10.00 Сериал "Доктор Куин, женщина — врач".
11.00, 13.00, 15.00 Сегодня днем.
11.20 Старый телевизор.
12.30 Время "Ч" с Ольгой Кучкиной.
13.20 Мишель Симон, Джордж Вильсон и Жак Перрен в мелодраме "Бланш" (Франция).
15.20 Устами младенца.
15.50 Сериал. "Любовь и тайны Сансет Бич" (США). 3-я серия.
16.40 Док. сериал. "Дикая природа" (Великобритания). 3-я серия "Воины радуги".
17.10 Впрок.
17.20 Криминал.
17.30 Футбольный клуб.
18.00, 21.00 Сегодня вечером.
18.40 Герой дня.
19.00 Н.Румянцева и Н.Рыбников в комедии "Девчата".
21.45 Сериал "Доктор Куин, женщина — врач".
22.35 Сегоднячко.
23.00 В полночь с Александром Герасимовым.
23.30 Теннис. Чемпионат мира в Ганновере.
23.45 Шоу Николая Фоменко "Империя страсти".
00.25 Эротические шоу мира: "Эммануэль, мир желаний-3", "Эмоции".

ТВ-6 Москва

06.05 Мультфильмы: "Золотой мальчик", "Катерок".
06.35, 17.00, 24.00, 01.10 Диск-канал.
07.05, 23.45 Дорожный патруль.
07.20, 09.05, 10.30, 13.25, 15.5 Телемагазин "Спасибо за покупку!"
07.45, 10.45, 13.45 Аптека.
08.00, 11.00, 14.00, 23.30 ТСН-6.
08.15 Ток-шоу "Сделай шаг".
09.40 Сериал "Хроники молодого Индианы Джонса".
11.10 А.Финни в фильме "Повесы" (Великобритания).
13.15, 00.50 Знак качества.
14.10 Л.Гурченко в фильме "Рецепт ее молодости".
16.05 Сериал "Флиппер II".
16.35 Те Кто.
17.50 Сериал "Грейс в огне III".
18.25 Программа "Назло рекордам!"
19.00 Сериал "Хроники молодого Индианы Джонса".
20.00 Новости дня.
20.25 А.Миронов, Е.Евстигнеев в комедии "Невероятные приключения итальянцев в России".
22.30 Шоу Ивана Демидова "Обоз".

8-й канал

18.00 Для детей. "Пострелята".
18.30 Программа Кеннета Копланда.
19.00 Сериал "Сирены".
19.45 Аэробика "Новый Эдем".
20.15 Вечарніца.
20.30 Худ. фильм "Спираль", 4-я серия.
22.00 Спорт-action.
22.30 Омар Шариф в худ. фильме "Далекие шатры".

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: (017) 229-28-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 229-29-04.

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

Рэгістрацыйнае пасведчанне №246. Нумар газеты надрукаваны з дыяпазітываў у ЗАТ "Летувас рытас". Адрас: г. Вільнюс, пр-т Гедыміна, 12а. Падпісаны ў друк у 21.00. Фармат А-2. Тыраж: першы завод — 502 00 экз. Заказ № 2593